http://bseu.by

*Г. Барвенава*
*ДНУ «ЦДБКМіЛ НАНБ» (г. Мінск)*

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ І КІТАЙСКІМ КАСЦЮМЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СВЕТАРАЗУМЕННЯ І ВЕКАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ

На працягу тысячагоддзяў ва ўсім свеце кіраўнікі краін – імператар, кароль, прэм’ер-міністр, прэзідэнт, палітычны дзеяч – з’яўляюцца тварам дзяржавы, яе культуры, нацыянальнага светаўспрымання і векавых традыцый. Імідж, вобраз кіраўніка дзяржавы – з’ява звыш складаная, бо чалавек на высокай дзяржаўнай пасадзе прадстаўляе не столькі сябе як асобу, а ўвасабляе нацыю, прэзентуе традыцыі, паводзіны, звычкі, манеры, характэрныя для гэтай нацыі.

Адным з важных кампанентаў іміджу дзяржавы з’яўляецца знешні выгляд яе кіраўніка, знешні выгляд яго жонкі, дзяцей. Над іх вобразам працуе калектыў спецыялістаў, якія прафесійна прадумваюць касцюм кіраўніка дзяржавы, яго жонкі падчас прыёмаў дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў, падчас кожнага з момантаў афіцыйных паездак у замежныя краіны (дзелавыя сустрэчы, афіцыйны прыём, паход у тэатр і г. д.). Праз адзенне кіраўніка дзяржавы, вопратку, іх колеравую гаму, тканіны, крой, аздобу, галаўныя ўборы, абутак паведамляецца пра традыцыі краіны, а таксама выказваецца павага да традыцый краіны, якая прымае дэлегацыю. Разгледзім асноўныя адметнасці адзення кіраўнікоў Беларусі і Кітая.

Адзенне Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі *Сі Цзіньпіна*, які займае пасаду з 14 сакавіка 2013 г., і яго жонкі *Пэн Ліюань* належна прэзентуе культуру і ўскосна палітычны курс дзяржавы. Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін носіць два варыянты адзення: традыцыйнае кітайскае адзенне і еўрапейскі дзелавы касцюм. Асноўным кампанентам касцюма Сі Цзіньпіна з'яўляецца адзенне *чжуншань* (кіт. 中山装), якое таксама называецца суньятсэнаўкай (кіт. 孫中山) у гонар Сунь Ятсэна, ці фрэнч Мао [2]. У распрацоўцы гэтай вопраткі

ўдзельнічаў Сунь Ятсэн (першы часовы прэзідэнт Кітайскай Рэспублікі 1912 г., аўтар дактрыны «Трох народных прынцыпаў») і ўкараніў яе ў якасці нацыянальнага адзення з ярка выражаным палітычным, пазней, урадавым падтэкстам неўзабаве пасля заснавання Кітайскай Рэспублікі. Пасля смерці Сунь Ятсэна ў 1925 г. народ надзяліў чжуншань рэвалюцыйным і патрыятычным сэнсам. Назавём асноўныя асаблівасці чжуншань. Адзенне чжуншань мае чатыры вонкавых кішэні (замест трох схаваных кішэняў пінжака заходняга дзелавога касцюма), захоўваючы традыцыйныя кітайскія ўяўленні аб балансе і сіметрыі, таксама існуе ўнутраная кішэня. Чатыры вонкавых кішэні чжуншань адлюстроўваюць чатыры дабрачыннасці, названыя ў кітайскім літаратурным помніку Гуань-цзы: прыстойнасць, справядлівасць, шчырасць і пачуццё сораму. Першапачаткова чжуншань зашпільваўся на сем гузікаў, затым іх колькасць зменшылася да пяці. Пяць галоўных гузікаў сімвалізуюць пяць юаняў (галін улады): заканадаўства, нагляд, інспекцыя, адміністрацыйнае кіраванне і юрысдыкцыя, пералічаныя ў канстытуцыі Кітайскай Рэспублікі, а тры гузікі на кожнай абшэўцы сімвалізуюць «Тры народных прынцыпы», сфармуляваныя Сунь Ятсенам: нацыяналізм, народаўладдзе і народны дабрабыт. Сцвярджаюць, што ў адрозненне ад верхніх частак заходніх дзелавых касцюмаў, якія звычайна шыюцца з некалькіх кавалкаў тканіны, чжуншань шыецца з аднаго кавалка, які сімвалізуе адзінства і любоў да свету Кітая.

Чжуншань носяць кітайскія лідары і чыноўнікі падчас удзелу ў важных дзяржаўных цырымоніях, пры выкананні ўрадавых абавязкаў, на ваенных парадах. Чжуншань апранаюць таксама на самыя важныя афіцыйныя цырымоніі ў якасці сімвала кітайскага нацыянальнага суверэнітэту. У такіх выпадках чжуншань, сшыты з шоўку, з вышыўкай па цэнтры полачкі, з хусткай, укладзенай у левую верхнюю кішэню, становіцца вячэрнім святочным ўборам, які эквівалентны ваеннай форме манарха або смокінгу прэзідэнта. Да прыкладу, Сі Цзіньпін у апісаным вышэй чжуншань быў на прыёме ў Яе Вялікасці Каралевы Англіі Елізаветы II, на прыёме ў караля Іспаніі Філіпа VI і г. д.

Жонка старшыні КНР Сі Цзіньпіна Пэн Ліюань таксама актыўна выкарыстоўвае і прэзентуе свету багатыя кітайскія

традыцыі ў адзенні, якое яна апранае на афіцыйныя прыёмы. Падчас сваёй сцэнічнай кар'еры Пэн Ліюань выступала ў ваеннай форме, бо была папулярнай выканаўцай народных песень у ваенным аркестры. Пэн Ліюань як жонка старшыні КНР падчас паездак з афіцыйнымі візітамі ў многія краіны свету – у Іспанію, ЗША, Польшчу, Бельгію, Беларусь і інш. расказвае ўсяму свету пра старажытныя эталоны прыгажосці, выпрацаваныя ў Кітаі, пра багацце шаўкаткацкай вытворчасці, распрацаваныя колеравыя спалучэнні і арнаменты, пра адметнасці шматслаёвага жаночага строю, традыцыі крою, асіметрычнай засцежкі і аздаблення галуном, пра адметнасці майстэрства гафту па шоўку, у тым ліку двухбаковага і многа іншага. Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пасля сустрэчы сказаў кітайскаму прэзідэнту Сі Цзіньпіну: «Я думаю, што ў Вас ашаламляльная жонка!»

*Аляксандр Лукашэнка,* як і кожны дзяржаўны лідар, прадстаўляе і ўвасабляе сабой дзяржаву Рэспубліка Беларусь. Падчас афіцыйных сустрэч ён носіць толькі еўрапейскага тыпу дзелавыя касцюмы і выглядае ў іх бездакорна [4]. За межы кансерватыўнай класікі ён выходзіць зрэдку і тое падчас паездак па Беларусі. Над яго вобразам працуюць прафесіяналы, якія падбіраюць адзенне з улікам персанальных метрычных асаблівасцяў будовы фігуры, не дапускаюць памылак з колерам гальштука ці іншых. Малодшы сын беларускага прэзідэнта *Мікалай* з красавіка 2008 г. з’яўляецца побач з бацькам на ўсіх мерапрыемствах і суправаджае яго ў замежных паездках. Яго знешні выгляд таксама прадстаўляе дзяржаву, адпаведна, ён апрануты ў адзенне колераў беларускага сцяга (першае з’яўленне перад журналістамі), у белую кашулю і белую камізэльку (2009, сустрэча з Папай Рымскім Бенедыктам XVI, Ватыкан), у ваенную форму з гербам Беларусі на пагонах і іншых варыянтаў (падчас парадаў; сустрэча з Дзмітрыем Мядзведзевым на Ваенных вучэннях «Захад-2009»), у працоўную ўніформу, у еўрапейскага тыпу дзелавы касцюм (2016, сустрэча з Папай Рымскім Францішакам, Ватыкан і г. д.) [1; 3].

Візіты Аляксандра Лукашэнкі з сынам ў Кітай не сталі выключэннем (2015, з нагоды 70-годдзя перамогі кітайскага народа ў вайне з Японіяй; 2017, удзел у форуме «Адзін пояс і адзін шлях»;

2018, саміт Шанхайскай Арганізацыі Супрацоўніцтва). На ўрачыстых прыёмах заўсёды праходзіць сумеснае фатаграфаванне, таму мы можам ацаніць знешні выгляд Аляксандра Лукашэнкі, яго сына Мікалая, старшыні КНР Сі Цзіньпіна і яго жонкі Пэн Ліюань. Іх вобраз і касцюм заўсёды прадуманы і выверaны.

Гасцям Беларусі стараюцца прадэманстраваць векавыя традыцыі і нацыянальны касцюм з першых іх крокаў на беларускай зямлі. Канцлера Германіі Ангелу Меркель і многіх іншых шаноўных міжнародных гасцей у аэрапорце сустракаюць *дзяўчаты* з хлебам-соллю, апранутыя ў *элегантныя стылізаваныя традыцыйныя беларускія строі.* Беларускія мастакі Юрый Піскун, Алена Галіеўская, Ірына Шуберт распрацавалі прэзентабельныя касцюмы для дзяўчат, у якіх яны выдатна праілюстравалі багатыя і разнастайныя беларускія строі розных этнаграфічных рэгіёнаў, іх кампаненты як камізэлькі, андаракі, мотальскія світкі і кажушкі, традыцыйныя тканіны, колеры, арнаменты, канструкцыю, прадуманы старажытны дэкор, варыянтныя галаўныя ўборы. Дзяўчаты ў ювелірна выкананых «залатых» строях працуюць падчас дзяржаўных урачыстасцяў, напрыклад, падчас уручэння дзяржаўных узнагарод. Вышыванкі таксама прысутнічаюць у расказе пра Беларусь. Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей у вышыванцы разам з сваёй жонкай Верай Паляковай і сынамі сустракае паслоў і прадстаўнікоў дыпламатычных місій з сем’ямі [5].

Такім чынам, асаблівыя адносіны кітайцаў да старажытнасці, гісторыі як да бясспрэчнага аўтарытэту – менавіта гэта вылучае стаўленне кітайцаў да традыцый, да інтэрпрэтацый свайго касцюма. Пра адзенне кіраўніка Кітая і яго жонкі можна сказаць словамі Сі Цзіньпіна падчас дзяржаўнага візіту ў Бельгію: «*Плод можа выглядаць гэтак жа, але смак зусім іншы».* Кіраўнік Кітая выконвае сваю асноўную задачу: захаванне і прапаганда сваіх культурных каштоўнасцяў, у тым ліку ў знешнім выглядзе. Беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка, які падчас афіцыйных сустрэч заўсёды апрануты ў еўрапейскі касцюм, таксама сваім знешнім выглядам дэманструе еўрапейскую Беларусь і яе павагу да еўрапейскіх каштоўнасцяў.

## Літаратура


1. Афіцыйны Інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://president.gov.by. – Дата доступа: 10.12.2018.

2. Костюм Мао [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 08.12.2018.

3. Лукашенко закрепил через папу Франциска свой миротворческий имидж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://naviny.by/rubrics/politic/2016/05/21/ic_articles_112_191717. – Дата доступа: 10.12.2018.

4. Новое платье короля. Стилисты предлагают новый имидж Лукашенко [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://naviny.by/rubrics/bomond/2014/09/02/ic_articles_121_186513.– Дата доступа: 10.12.2018.

5. Самоидентификация в виде вышиванок, языка и культуры влияет на укрепление нашей независимости. Макей пригласил на прием послов в национальных костюмах [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://nn.by/?c=ar&i=212051&lang=ru. – Дата доступа: 10.12.2018.